


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

8 ЖНІЎНЯ 2020 г. СУБОТА № 153 (29267)

З першых вуснаў

# «МЫ ЗМАГЛІ ЯШЧЭ РАЗ УБАЧЫЦЬ І АЦАНІЦЬ, ЯКІЯ НЕЗВЫЧАЙНЫЯ ЛЮДЗІ ЖЫВУЦЬ СЯРОД НАС»

## МЕДЫКАМ УРУЧАНЫ ДЗЯРЖАЎНЫЯ ЎЗНАГАРОДЫ



Фота БелТА.

**Героі носяць белыя халаты. І рэспіратары з пальчаткамі. Ратуюць кожнае жыццё: нават калі, здаецца, шанцаў ужо няма, калі сам хворы стаміўся трымацца — яны працягваюць. І перамагаюць. Апошнія тры месяцы выразна прадэманстравалі: калі змагацца разам, поспех будзе. Абраны Беларуссю шлях барацьбы з эпідэміяй — новай, невядомай і таму больш небяспечнай — аказаўся правільным.**

Хтосьці і дагэтуль можа крытыкаваць, але з чым пагодзіцца, напэўна, кожны і ў краіне, і за яе межамі — мы здолелі пазбегнуць панікі. У гэтым і вялікая заслуга медыцынскіх работнікаў. Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка не мог не падзякаваць ім асабіста. Учора ўпершыню ў зале дзяржузнагарод Палаца Незалежнасці сабраліся людзі толькі адной сферы.

«Я вельмі рад, што вы паступова вяртаецеся да звыклага жыцця. Можаце нарэшце абняць сваіх дзяцей, нехта жонак, мужоў, бацькоў, якіх вы не бачылі тыднямі, а часам, месяцамі, бо многія з вас жылі ў бальніцах і лабараторыях. Перакананы, расстанне далося вам нялёгка. Але ў любым працэсе ёсць як плюсы, так і мінусы. Вы добраахвотна пайшлі на гэта дзеля вернасці прафесійнаму абавязку», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што медыкі рызыкавалі сабой не толькі праз небяспеку заразіцца COVID-19, але і праз фізічныя і эмацыянальныя нагрузкі, праз бяссонныя ночы каля ложкаў самых складаных пацыентаў. Гатовых рэцэптаў лячэння каранавіруснай інфекцыі няма, і, як заяўляе СААЗ, наўрад ці яны будуць, заўважыў кіраўнік дзяржавы.

«Але разам мы справіліся. Насуперак усім крытыкам і нядобразычліўцам. Іх было шмат, іх застаецца шмат, іх будзе нямала, таму што, як я вас папярэджваў тры месяцы таму, ***пандэмія — гэта не проста хвароба, гэта палітычнае і, ужо сёння мы бачым, эканамічнае — нават не супрацьстаянне, а вайна.*** Усе дзяржавы імкнуцца скарыстаць гэтую хваробу, каб узвысіцца і апусціць іншых, калі гэта ў іх атрымаецца», — паўтарыў Аляксандр Лукашэнка.

Учарашні дзень ён лічыць сапраўды гістарычным. Як падкрэсліў Прэзідэнт, медыкаў, якія змагаліся з каранавірусам, у апошнія дні заслужана ўшаноўвалі па ўсёй краіне. Кіраўнік краіны прызнаўся: ён марыць запрасіць усіх працаўнікоў сістэмы аховы здароўя, каб падзякаваць. Але колькасць людзей у белых халатах гэтага не дазваляе (проста таму, што няма ў Беларусі такога вялікага палаца) — таму ўся вертыкаль улады па даручэнні першай асобы сустрэлася з тымі, хто змагаўся з хваробай. І, нарэшце, кульмінацыя: у Палац Незалежнасці таксама запрошаны ўрачы з розных рэгіёнаў Беларусі.

«Я рады магчымасці асабіста падзякаваць вам і ў вашай асобе ўсім медыцынскім работнікам краіны за самаадданую і нават гераічную працу», — звярнуўся да гасцей кіраўнік краіны.

Беларускі лідар аддаў належнае пульманолагам і інфекцыяністам, а таксама ўрачам іншых спецыяльнасцяў, якія экстранна асвоілі новую для сябе спецыялізацыю; рэаніматолагам, урачам першаснага звяна і хуткай дапамогі, медыцынскім сёстрам і малодшаму персаналу, памочнікам і фельчарам, спецыялістам санітарна-эпідэміялагічнай службы, урачам лабараторнай дыягностыкі; навукоўцам, галоўным урачам і кіраўнікам-арганізатарам, супрацоўнікам міністэрства аховы здароўя.

***«Усе вы, забыўшыся пра рэгаліі, ішлі да агульнай мэты, не шкадуючы сябе.*** Часам спачатку нават не ўсведамляючы, што будзе заўтра. Хачу падзякаваць студэнтам старэйшых курсаў медыцынскіх ВНУ. Яны яшчэ нават не паспелі даць клятву беларускага ўрача, але ўжо выканалі ўсе пункты гэтай клятвы, стаўшы плячом да пляча з дыпламаванымі спецыялістамі. Маладыя людзі паказалі, што вырасла ці вырастае годная змена — медыкі, для якіх важнейшыя за ўсё на свеце гуманізм і вернасць абранай прафесіі», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2

## КОРАТКА

• **Самая высокая ўраджайнасць збожжавых — у Гродзенскай вобласці.**

• Беларускія навукоўцы распрацавалі сістэмы падагрэву газаў для ачышчэння дыхальных шляхоў ад COVID-19.

• **Новы пашпарт у 100-гадовы юбілей уручылі ветэрану Вялікай Айчыннай вайны з Гродна Надзеі Пятрыга.**



• Беларусам дазволілі ўезд у Чарнагорыю без абмежаванняў з 7 жніўня.

# БЕЛАРУСЬ ВЫБІРАЕ БУДУЧЫНЮ




*Шматдзетная сям'я КУЗНЯЦОВЫХ з Наваполацка на ўчастку для галасавання №17.*

Фота БелТА.

ISSN 1990 - 763X

# «МЫ ЗМАГЛІ ЯШЧЭ РАЗ УБАЧЫЦЬ І АЦАНІЦЬ, ЯКІЯ НЕЗВЫЧАЙНЫЯ ЛЮДЗІ ЖЫВУЦЬ СЯРОД НАС»

## КУПІЦЬ УСЁ АСТАТНЯЕ

Прэзідэнт ужо расказваў, што на барацьбу з каранавірусам дзяржава выдаткавала больш за паўмільярда рублёў. І сёння нагадаў, што хоць Беларусь — небагатая краіна, але ў ёй добра разумеюць, што кожная новая тэхналогія, абсталяванне або лекі — гэта сотні і тысячы выратаваных жыццяў. І эканоміць на гэтым нельга.

«Перакананы, што і нейкія прэміяльныя выплаты ўрачам, якія працуюць суткамі, — таксама заслужанае заахвочванне. А ў будучай пяцігодцы, вы ведаеце, ***даручана ўраду сярэднюю заработную плату для медыцынскіх работнікаў падняць да 150 працэнтаў сярэдняй па краіне»,*** — паведаміў Прэзідэнт.

Учора ён не толькі ўручыў ордэны і медалі. Ганаровае званне «Народны ўрач Беларусі» прысвоена прафесару, доктару медыцынскіх навук, загадчыку кафедры інфекцыйных хвароб Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Ігару Карпаву.

«Цяпер, падчас эпідэміі каранавіруса, менавіта ён узначаліў работу па аказанні дапамогі пацыентам: непасрэдна ездзіў па рэгіёнах, займаючыся самымі цяжкімі выпадкамі, кансультаваў, дапамагаў, што граху таіць — і патрабаваў. Гэта яркі, самы годны прыклад сапраўднага народнага ўрача Беларусі», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Усім медыцынскім работнікам і іх блізкім Прэзідэнт пажадаў перш за ўсё здароўя — а яшчэ шчасця і дабрабыту.

«Жывіце доўга, будзеце жыць вы — будзе жыць нацыя. ***Мы перажылі складаны перыяд, але дзякуючы гэтаму змаглі яшчэ раз убачыць і ацаніць, якія незвычайныя людзі жывуць сярод нас.*** Яшчэ раз дзякуй вам за ўсё тое, што вы зрабілі. Але, як вы разумееце не горш за мяне, расслабляцца нам ні ў якім выпадку нельга. Мы назапасілі велізарны досвед барацьбы (гэта не работа была, гэта была барацьба, гэта была вайна, як некаторыя вызначалі). ***Назапасіўшы гэты досвед, мы павінны зрабіць усё, каб у будучыні ні другой, ні трэцяй хвалі ў Беларусі не было.*** А калі, крый божа, нешта здарыцца, каб мы, ужо падрыхтаваныя, змаглі стаць разам і абараніць наш народ, вас перш за ўсё», — звярнуўся да ўдзельнікаў урачыстасці беларускі лідар.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## БЕЗ ПАНІКІ

Міністр аховы здароўя Уладзімір Каранік падчас цырымоніі нагадаў, што час эпідэміі змяніў звыклы лад працы ўсіх без выключэння работнікаў сістэмы аховы здароўя, уся сістэма ў цэлым і кожны супрацоўнік прайшлі праверку на трываласць.

«Мы адчулі масу эмоцый за гэтыя месяцы: былі і гарката страт, і радасць перамог — але ніколі не было панікі, ніколі не было адчування, што мы не справімся. І галоўнае, ніколі не было адчування, што нас кінулі. Як бы цяжка ні было, мы заўсёды адчувалі падтрымку дзяржавы, асабіста вас, Аляксандр Рыгоравіч, грамадства — і гэта было здорава, гэта дапамагала», — падзякаваў Прэзідэнту міністр.

Асноўнае пачуццё Уладзіміра Караніка сёння — гордасць. За калег, за краіну, за тое, што было зроблена за гады незалежнасці для айчыннай аховы здароўя і дапамагло з гонарам прайсці гэты іспыт. Таму кіраўнік ведамства падзякаваў за веру ў медыкаў, за тое, што Прэзідэнт не сумняваўся: беларускія медыкі пройдуць там, дзе не прайшлі іншыя.

«Мы выйшлі з гэтай сітуацыі больш дасведчаныя, больш моцныя і гатовыя і надалей развіваць сістэму аховы здароўя на карысць моцнай і незалежнай Беларусі», — адзначыў міністр.

## РАТУЕ КРОПЛЯ КРЫВІ

Пераадоленне каранавіруса стала агульным дасягненнем беларускага грамадства. У дапамогу медыкам у барацьбу, кожны на сваім месцы, уключыліся ўсе — ад бізнесменаў і былых пацыентаў да, як высветлілася ўчора, асабіста Прэзідэнта. Аляксандр Лукашэнка, які перанёс каранавірус, папрасіў запісаць яго ў «залаты фонд» людзей, што здаюць плазму крыві для лячэння хворых.

«Ты (Уладзіміру Караніку. — **Зв.**) вазьмі гэту плазму, увядзі ўсім апазіцыянерам па кроплі. Самы просты шлях павярнуць іх у бок дзяржавы (і ў мой бок). Яны не адмовяцца, ты ж ведаеш — калі ў рэанімацыю трапляеш, там ужо не глядзіш, якая кроў, абы выжыць», — і жартам, і ўсур'ёз сказаў кіраўнік дзяржавы.

Асобна ён падзякаваў урачам за тое, што паставілі яго на ногі.

**Варвара МАРОЗАВА.**

У тэму

# «У НАС САПРАЎДЫ НАРОДНАЯ МЕДЫЦЫНА»



Фота БелТА

«Для людзей нашага пакалення слова «народны», напэўна, з'яўляецца найвышэйшай формай пашаны. Гэта выдатны тэрмін, з якім наша пакаленне пражыла ўсё сваё працоўнае жыццё, — сказаў, прымаючы з рук кіраўніка дзяржавы высокую ўзнагароду, **Народны ўрач Беларусі Ігар КАРПАЎ.** — Тое, што я стаю сёння тут, — пахвальны для мяне збег абставін. А вось тое, што наша медыцына аказалася прафесійнай, мужнай і падрыхтаванай да цяжкіх момантаў, што аказвалася дапамога на ўсіх узроўнях і яна дайшла да ўсіх рэгіёнаў краіны, сведчыць пра тое, што ў нас сапраўды народная медыцына і што вы, паважаныя прысутныя, з'яўляецеся народнымі медыкамі».



У размове з журналістамі ён казаў пра тое, што не хацеў бы вылучаць у сваёй працоўнай біяграфіі перыяд барацьбы з пандэміяй асабліва.

«Прафесія ўрача — гэта прафесія, якая заўсёды завязаная на канкрэтны выпадак, — сказаў прафесар. — Тут проста іх было шмат. Шмат пацыентаў, інфекцыяніст да гэтага гатовы псіхалагічна; складваліся сітуацыі, калі даводзілася аказваць дапамогу многім, з дапамогай калег. Вядома, гэта былі складаныя часы, але я не магу і не хачу іх вылучаць, бо калі перад табой складаны пацыент, яго жыццё, і ты павінен прыкласці намаганні, каб такому чалавеку дапамагчы, гэта само па сабе — вялікая справа, і кожны выпадак уяўляецца надзвычай важным і складаным.

Многія кажуць, што ўрачэбная спецыяльнасць цяжкая, але гэта і вялізная адказнасць урача, які змагаецца за жыццё пацыента. Таму асаблівасць нашай, у самым шырокім сэнсе, спецыяльнасці — уключыцца ў сітуацыю ў любы момант цалкам. Таксама тут няма нічога сарамлівага і страшнага паклікаць калег, якія са свайго пункту гледжання могуць дапамагчы дадзенаму канкрэтнаму чалавеку. Гэта абсалютна правільны падыход. Любяць казаць: «Хірургія — справа калектыўная». Хачу дадаць: медыцына сёння, пры сучасным узроўні развіцця, справа вельмі калектыўная».

Ігар Карпенка адзначыў работу Міністэрства аховы здароўя: «Напэўна, не паграшу супраць ісціны, і калегі мяне наўрад ці папраўяць тут: міністр быў першым, хто ездзіў ва ўсе ачагі. Гэта не ліслівасць ні ў якім разе (тыя, хто ведае мяне, пацвердзяць — гэтая якасць мне не характэрная). Я старэйшы за яго амаль на 20 гадоў і хачу сказаць, што гэта абсалютна правільная стратэгія паводзін разумнага адміністратара, проста інтэлігентнага чалавека і ўрача ў дадзенай сітуацыі. Спачатку быў ён, а побач, ці трошкі пазней, ехалі ў тыя праблемныя рэгіёны людзі. Была дастаткова добра пастаўленая работа. Гэта праўда».

**Урач — анестэзіёлаг-рэаніматолаг, дацэнт кафедры анестэзіялогіі і рэаніматалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Вольга СВЯТЛІЦКАЯ** лічыць, што пандэмія паказала, наколькі наша грамадства насамрэч сталае і кансалідаванае.

«Людзі самых розных спецыяльнасцяў, светапоглядаў, узростаў аб'ядналіся, каб вырашыць гэтую цяжкую праблему, — звярнула яна ўвагу прадстаўнікоў прэсы. — Сродкі індывідуальнай аховы шылі звычайныя валанцёры дома, рабілі шчыткі, шылі дзяржаўныя прадпрыемствы і прыватныя кампаніі — разам. Усе аб'ядналіся, каб сабраць грошы і дапамагчы. Бюджэтныя арганізацыі і сілавыя структуры рабілі ўсё магчымае, каб падтрымаць сістэму аховы здароўя ў гэты час. Гэта сведчыць, што мы можам аб'ядноўвацца і таму перамагаем. Калі мы бачым нейкую праблему, наша грамадства саспела, каб яе вырашыць спакойна, кансалідавана, разам. І мне гэта вельмі падабаецца.

Вельмі грэла душу, калі людзі прыязджалі ў бальніцу і нешта рабілі для нас. Памятаю, нам трэба было закрыць ад кварцавай лямпы, якая ўвесь час гарэла ў пакоі для пераадзявання, празрыстыя дзверы рэанімацыі. Прадстаўнікі кампаніі, якая вырашала гэту праблему, потым яшчэ двойчы прыязджалі самі і казалі: «Мы хочам хоць нечым дапамагчы вам». Гэта кранала нашы сэрцы і нам хацелася працаваць, гэта натхняла.

Тое, што работу медработнікаў ацанілі належным чынам, вельмі важна. Бо хочацца зноў працаваць, хочацца выратоўваць людзей, і становіцца не страшна — ведаю, што за мной стаіць увесь народ Беларусі, які, калі нешта трэба, аб'яднаецца, дапаможа, мы ўсё зробім разам. Я вельмі ўдзячная сённяшняму дню, вельмі ўдзячная беларускім людзям.

Мілыя, дарагія мае суайчыннікі, дзе б вы ні былі, я вам вельмі ўдзячная за тое, што вы былі побач, за тое, што вы падтрымлівалі нас, выконвалі нашы рэкамендацыі! Я думаю, што ўсё ў нас будзе добра».

Было складана насамрэч, прызнаецца **член маніторынгавай групы па COVID-19, галоўная медыцынская сястра Гарадской клінічнай інфекцыйнай бальніцы горада Мінска Ірына ПАРЫМОН.**

«Людзі, якія ўчора былі хірургамі і кардыёлагамі, вымушаныя былі ў адзін дзень стаць інфекцыяністамі. Ім трэба было падказаць, дапамагчы. Але ўсе не проста слухалі, а чулі, што трэба рабіць, — расказала яна. — Так і працавалі. Усе з'ядналіся і працавалі як адзіная каманда. Ладзіліся відэаканферэнцыі па ўсёй краіне, усе бралі ўдзел, задавалі пытанні, атрымлівалі адказы. Мы многае перанялі ў замежных калег, але прыстасоўвалі іх вопыт для сябе і распрацоўвалі ўласныя методыкі.

Самае складанае было тое, што 24 гадзіны ў суткі знаходзішся на рабоце: ні выходных, ні вечароў, нічога, ні сям'і, ні дзяцей не бачыш. Але калі пацыенты ачуньвалі і дзякавалі, усё акуплялася. Наша маніторынгавая група аб'ездзіла ўсе рэгіёны. Калі мы заходзілі ў клінікі да пацыентаў пагутарыць, даведацца, як яны сябе адчуваюць, яны замест вітання казалі такі шчыры дзякуй, што ў нас слёзы наварочваліся.

Медык — гэта прызванне, выпадковых людзей няма ў медыцыне, але, калі б не такая каласальная падтрымка грамадства, думаю, частка медыкаў бы здалася. Падтрымка звычайных людзей надавала нам сілы».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## АД АСАБІСТАГА ДА ГЛАБАЛЬНАГА

У эфір выйшла поўная версія інтэрв'ю Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ўкраінскаму журналісту Дзмітрыю Гардону. Размова, якая цягнулася 4 жніўня амаль тры гадзіны, пабачыла свет у праграме «В гостях у Дмитрия Гордона» на яго YouTube-канале. Інтэрв'ю, апублікаванае ў чацвер, ужо ўчарашнім днём мела амаль 1 400 000 праглядаў! Каментарыі пакінулі 18 000 карыстальнікаў.

Інтэрв'ю выклікала чаканы рэзананс, бо Дзмітрый Гардон вядомы сваімі нетыповымі і «вострымі» пытаннямі. Не абышлося без іх і гэтым разам. Прэзідэнт упершыню расказаў пра свайго бацьку, а таксама пра асаблівыя адносіны з цешчай, пра тое, хто галоўны крытык палітыкі Прэзідэнта ў яго сям'і, за якія якасці ён цэніць Уладзіміра Пуціна і лічыць яго старэйшым братам, хто даў яму мянушку «апошні дыктатар Еўропы» і ці адчувае ён мандраж перад чарговымі выбарамі.

***Друкаваную версію інтэрв'ю можна ўбачыць і на нашым афіцыйным сайце http://www.zviazda.by.***

## РАЗАБРАЦЦА РАЗАМ

**Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін учора патэлефанаваў прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку. Тэмы 20-хвіліннай размовы — «ковід», выбарчая кампанія і затрыманне 33 расійскіх грамадзян.**

Акрамя двухбаковага парадку, частка гутаркі датычылася процідзеяння пандэміі COVID-19 у дзвюх краінах, выпрацоўкі вакцыны для барацьбы з гэтай інфекцыяй. Абмеркавалі кіраўнікі дзяржаў выбарчую кампанію ў нашай краіне. Прэзідэнт Расіі падкрэсліў важнасць далейшага развіцця брацкіх беларуска-расійскіх адносін. Ён упэўнены ў неабходнасці супрацьстаяць негатыўным тэндэнцыям і дзеянням трэціх сіл, якія могуць прывесці да іх пагаршэння.

Як перадае прэс-служба Прэзідэнта Беларусі, адной з галоўных тэм размовы стала затрыманне 33 расійскіх грамадзян на тэрыторыі Беларусі. У сувязі з гэтым было падкрэслена імкненне разам самым сур'ёзным чынам разабрацца ў сітуацыі, якая склалася. Прэзідэнты дамовіліся старанна вывучыць кожны існуючы факт, каб устанавіць сапраўдныя прычыны гэтага здарэння, сітуацыі, знайсці вінаватых і прыцягнуць іх да адказнасці.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Выбары-2020

# БУДУЧЫНЯ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД ГОЛАСУ КОЖНАГА

**На выбарчым участку № 2 у сярэдняй школе № 32 Мінска зрабіў свой выбар адносна будучага лідара краіны кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА. Як ён адзначыў, заўсёды галасуе датэрмінова з прычыны сваёй загружанасці па рабоце.**



Фота БелТА.

«Я аддаў свой голас за будучыню краіны, за Беларусь, за развіццё тых сацыяльных праграм, якія накіраваны на павышэнне дабрабыту народа. Адзін з прыкладаў нашай сацыяльнай палітыкі — гэтая выдатная школа. Такіх школ у нас па некалькі здаецца кожны год, — перадае словы Ігара Сергеенкі БелТА. — Так, сёння час па-свойму незвычайны, няпросты, і мы павінны згуртавацца як адзіная нацыя, адзіны народ перад тварам тых выклікаў і пагроз, якія існуюць у свеце і вакол нашай краіны. Сапраўды гэтак жа, як мы з'ядналіся перад тварам гэтай страшнай хваробы — COVID-19».

Як дадаў кіраўнік Адміністрацыі, будучыня краіны сёння залежыць ад голасу кожнага беларуса. «Залежыць, як будуць жыць нашы дзеці, як будуць рэалізоўвацца тыя ці іншыя сацыяльныя праграмы, ахова здароўя, культура, навука, самае галоўнае — эканоміка. Будзе развівацца эканоміка — будуць выдзяляцца сродкі для развіцця ўсіх магчымасцяў чалавека. Таму голас кожнага важны ў любой выбарчай кампаніі, і ў гэтай кампаніі тым больш», — падкрэсліў Ігар Сергеенка.




# ЯК НЕ ПАТАНУЦЬ У ЛАВІНЕ ІНФАРМАЦЫІ

## Эксперты медыя абмеркавалі асвятленне выбарчай кампаніі ў беларускіх сродках масавай інфармацыі

**Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь зрабілі заўважнай канкурэнцыю паміж традыцыйнымі і новымі медыя. Да такога вываду прыйшлі ўдзельнікі прэс-канферэнцыі «Выбарчая кампанія ў люстэрку масмедыя. Вынікі маніторынгу матэрыялаў СМІ, праведзенага Беларускім саюзам журналістаў», якая адбылася 7 жніўня ў прэс-цэнтры Дома друку.**

**Першы намеснік старшыні Беларускага саюза журналістаў, галоўны рэдактар часопіса «Журналіст» Сяргей СВЕРКУНОЎ** расказаў, як беларускія медыя асвятляюць выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь: «Інфармацыйнае суправаджэнне выбарчай кампаніі праводзіцца на належным высокім узроўні. У СМІ ўсебакова і аб'ектыўна асвятляліся ўсе этапы выбарчай кампаніі: утварэнне выбарчых камісій і ўчасткаў для галасавання, збор подпісаў, рэгістрацыя кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь і іншыя. Усім кандыдатам у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь былі дадзены роўныя правы на бясплатныя выступленні ў тэле- і радыёэфіры, бясплатную публікацыю сваіх перадвыбарчых праграм у друкаваных СМІ. Дзяржаўныя СМІ, у строгай адпаведнасці з заканадаўствам, гэтыя правы былі выкананыя ў поўнай меры. Ва ўсіх вядучых медыя публікаваліся інтэрв'ю з кандыдатамі ў Прэзідэнты. На тэлебачанні і радыё быў прадстаўлены ўвесь спектр меркаванняў, якія адлюстроўваюць пазіцыю кожнага кандыдата. Гэта, на наш погляд, — галоўнае. Пры аналізе інфармацыйнага поля ў кантэксце выбарчай кампаніі неабходна ўлічваць і інтэрнэт-рэсурсы. Як сведчыць аналіз іх кантэнту, большасць з іх прадстаўляе апазіцыйны пункт погляду».

Гэта галоўная выснова папярэдняга маніторынгу беларускіх СМІ, канчатковыя вынікі будуць апублікаваны ў новым выпуску часопіса «Журналіст» у верасні.

**Дацэнт кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі, куратар спецыяльнасці «Журналістыка» (вэб-журналістыка) БДУ, кандыдат філалагічных навук Аляксандр ГРАДЗЮШКА** звярнуў увагу на перамены ў інфармацыйным полі, якія суправаджаюць выбарчую кампанію — 2020: «Калі раней інтэрнэт-СМІ ўспрымаліся як нешта несур'ёзнае, дык сёлета мы бачым, як яны займаюць першае месца ў структуры медыяспажывання. Размова ідзе не толькі пра сайты, але і пра тэлеграм-каналы, сацыяльныя сеткі ды новыя анлайн-платформы. Мы бачым, як традыцыйнае інфармацыйнае поле змяняецца. Маладая аўдыторыя спажывае інфармацыю менавіта з новых медыя, а традыцыйныя СМІ адыходзяць на другі план. Новыя тэхналогіі валодаюць вялікім патэнцыялам. Але іх не трэба баяцца».

На думку экспертаў, новыя медыя ахінаюць карыстальнікаў своеасаблівымі рэхакамерамі, якія не прапускаюць альтэрнатыўную і часам праўдзівую інфармацыю. Спецыялісты ўпэўненыя: каб спажываць аб'ектыўную і праўдзівую інфармацыю, трэба развіваць медыя-адукаванасць, выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі, не абмяжоўваючыся «новымі медыя». «Гэта сур'ёзны выклік для журналістыкі ў цэлым і для нашай медыйнай сферы. Спадзяюся, айчынныя медыясфера і журналістыка з гэтым выклікам справяцца», — адзначыў Аляксандр Градзюшка.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Энергетыка

# У РЭАКТАР АЭС ЗАГРУЖАЮЦЬ ЯДЗЕРНАЕ ПАЛІВА

**Першую са 164 цеплавыдзяляльных зборак (ЦВЗ) са свежым ядзерным палівам загрузілі ўчора ў актыўную зону першага рэактара. Да канца месяца загрузяць астатнія ЦВЗ. А пасля пацвярджэння надзейнасці і бяспекі работы энергаблока на праектных параметрах пачнецца энергетычны пуск, і энергаблок упершыню падключаць да энергасеткі, паведамляе прэс-служба Дзяржкарпарацыі «Расатам».**

Пасля загрузкі паліва рэактар выведуць на мінімальна кантраляваны ўзровень (1 % магутнасці) з правядзеннем адпаведных даследаванняў. З гэтага моманту рэактар набывае статус ядзернай энергетычнай устаноўкі, якая пачне працаваць у энергасістэме пасля пацвярджэння надзейнасці свайго функцыянавання.

Энергаблок збудаваны па самых сучасных тэхналогіях пакалення 3+. Тут улічаны ўсе «постфукусімскія» патрабаванні бяспекі, і рэферэнтнасць якіх пацверджана эксплуатацыяй аналагічных блокаў у Расіі. Камплектны пастаўшчык ключавога абсталявання ядзернага вострава для Беларускай АЭС — Атамэнергамаш, а паліва для рэактара выраблена на Новасібірскім заводзе хімканцэнтратаў.

Праект будаўніцтва АЭС у Беларусі рэалізуецца адкрыта, ва ўзаемадзеянні з кіраўніцтвам і экспертамі МАГАТЭ, а таксама з прадстаўнікамі Еўракамісіі і Еўрапейскай групы рэгулюючых органаў ядзернай бяспекі ENSREG. За 2012–2020 гады на станцыі праведзена сем ключавых місій МАГАТЭ, якія рэкамендаваныя для краін, дзе будуецца першая атамная станцыя.

— У параўнанні з энергаблокамі папярэдняга пакалення з рэактарамі ВВЭР-1000 інавацыйны энергаблок з рэактарам ВВЭР-1200 валодае шэрагам пераваг, якія істотна павышаюць яго эканамічныя характарыстыкі, — запэўніў **Андрэй ПЯТРОЎ, першы віцэ-прэзідэнт па стварэнні АТ ІК «АСЭ», генеральны дырэктар канцэрна «Расэнергаатам».** — Галоўная асаблівасць сучаснага рэактара — унікальнае спалучэнне актыўных і пасіўных сістэм бяспекі, якія робяць АЭС максімальна ўстойлівай да знешніх і ўнутраных уздзеянняў.

Усе энергаблокі аснашчаны, напрыклад, «пасткай расплаву» — прыстасаваннем для лакалізацыі расплаву актыўнай зоны ядзернага рэактара. А яшчэ сістэмай пасіўнага адводу цяпла праз парагенератары, задача якой ва ўмовах поўнай адсутнасці крыніц энергазабеспячэння — без удзелу апаратараў забяспечыць працяглы адвод у атмасферу цяпла ад актыўнай зоны рэактара.

— Акрамя таго, магутнасць устаноўкі вырасла на 20 %. Значна зменшана колькасць абслуговага персаналу. Праектны тэрмін службы асноўнага абсталявання павялічаны ўдвая — з 30 да 60 гадоў з магчымасцю працягнення яшчэ на 20 гадоў, — дадаў эксперт.

За час будаўніцтва атамнай станцыі ў Астравецкім раёне было створана больш за 2,5 тысячы рабочых месцаў (на самой АЭС і ў арганізацыях, якія яе абслугоўваюць). Будаўніцтва надало таксама імпульс мадэрнізацыі інфраструктуры Астраўца. Тут з'явіліся два новыя жылыя мікараёны, пажарная часць, дзве школы, чатыры садкі, бальніца, веласцежкі, паркі, фізкультурна-аздараўленчыя цэнтры і стадыён для мясцовай футбольнай каманды.

Нагадаем, што атамная станцыя будуецца з мэтай атрымання стабільнай экалагічна чыстай крыніцы энергіі. Праектная магутнасць аднаго атамнага рэактара Беларускай АЭС дазваляе выпрацоўваць за суткі да 27 мільёнаў кілават-гадзін. Гэта 9855 мільёнаў кілават-гадзін за год. З уводам у работу абодвух рэактараў Беларусь зможа забяспечыць трэціну сваіх унутраных патрэб у электраэнергіі.

Павелічэнне долі атамнай энергетыкі ў агульным электраэнергетычным балансе краіны дапаможа знізіць агульны кошт электраэнергіі за кошт скарачэння затрат на паліва. Па ацэнках экспертаў, з запускам АЭС яе прадукцыяй штогод будзе замяшчацца 4,5 мільярда кубаметраў прыроднага газу, а выкіды парніковых газаў зменшацца больш чым на 7 мільёнаў тон у год.

**Ірына СІДАРОК.**

Зазірнуць за гарызонт

# Наша біятэхналагічная будучыня

## Як новыя дасягненні вучоных паляпшаюць якасць жыцця і здароўя чалавека?

**Па прагнозах спецыялістаў, не менш як 20 працэнтаў ад аб'ёму тавараў у XXI стагоддзі будзе за біятэхналогіямі. Тэмпы росту па асобных сегментах рынку вагаюцца ад 5—7 да 30 працэнтаў штогод. Ужо да канца 2020 года аб'ём сусветнага рынку біятэхналогій вырасце да 600 млрд долараў ЗША. Прадукцыя, якая атрымліваецца з дапамогай прамысловых біятэхналогій, мае выхад практычна ва ўсе галіны. У энергетыцы гэта розныя віды біяпаліва. У медыцыне — сыравіна для фармацэўтычнай прамысловасці і біяфармацэўтычныя тэхналогіі, у сельскай гаспадарцы — сродкі аховы раслін і жывёл, мікробныя ўгнаенні, кармавыя дабаўкі, у харчовай прамысловасці — ферментныя прэпараты, харчовыя дабаўкі з лячэбна-прафілактычнымі ўласцівасцямі, вугляродна-энергетычныя сумесі, заменнікі цукру і г. д.**

**Прадукты і паслугі, атрыманыя пры дапамозе біятэхналогій, паступова замяшчаюць традыцыйныя прадукты. Прапануюцца і прынцыпова новыя прадукты, якія не могуць быць атрыманыя ніякімі іншымі спосабамі. А ў Атлас новых прафесій увайшлі такія, напрыклад, як урбаніст-эколаг, біяфармаколаг, сістэмны біятэхнолаг, архітэктар жывых сістэм...**

### Ад фундаментальнай навукі — да практыкі

— Індустрыя біятэхналогій развіваецца вельмі імкліва. Яе тэмпы ўражваюць, і гэта ставіць перад беларускай навукай адказныя задачы, — падкрэслівае **намеснік старшыні намесніка Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандр КІЛЬЧЭЎСКІ.** — Асноўныя сферы прымянення біятэхналогій — медыцына і фармацэўтыка, сельская гаспадарка і прамысловасць, энергетыка і ахова навакольнага асяроддзя. Біятэхналагі дзеляць свае кірункі па колерах: біяфармацэўтыка — гэта чырвоны кірунак (на яе прыпадае 60 працэнтаў сусветнага рынку), прамысловыя біятэхналогіі — белы (сюды ўваходзіць і біяэнергетыка) — 35 працэнтаў рынку. На аграбіятэхналогіі (зялёны кірунак) і прыродаахоўныя (шэры) прыпадае ў сукупнасці яшчэ пяць працэнтаў.

Аляксандр Кільчэўскі запэўнівае: «Біятэхналагічны кірунак у нашай краіне працуе на годным узроўні і паспяхова развіваецца дзякуючы падтрымцы дзяржавы. З замежнымі калегамі мы кантактуем на роўных. Двойчы арганізоўвалі ў Мінску Еўрапейскую школу біятэхналогій для маладых навукоўцаў, і госці з-за мяжы захапляліся нашай матываванай і добра падрыхтаванай моладдзю. У краіне створаны моцны навуковы патэнцыял. Даследаванні выконваюцца па шэрагу дзяржпраграм. Ёсць і саюзная праграма «ДНК-ідэнтыфікацыя», накіраваная на распрацоўкі ў галіне медыцыны і крыміналістыкі. Акрамя Нацыянальнай акадэміі навук, у біятэхналагічных даследаваннях удзельнічаюць арганізацыі Міністэрства аховы здароўя, Мінадукацыі, Мінсельгасхарча і іншых ведамстваў.

Але біятэхналагічная навука — не толькі фундаментальная, а яшчэ і прыкладная. Усе інстытуты біялагічнага профілю ствараюць інавацыйныя структуры для таго, каб навуковыя дасягненні не пыліліся на паліцах, а ўкараняліся ў практыку: медыцыну, сельскую гаспадарку і ахову навакольнага асяроддзя».

У НАН створаны некалькі каштоўных калекцый. У прыватнасці, у Інстытуце мікрабіялогіі захоўваецца калекцыя непатагенных мікраарганізмаў. У Інстытуце генетыкі — Рэспубліканскі банк даных ДНК чалавека, жывёл, раслін і мікраарганізмаў. У Інстытуце лесу ёсць калекцыя штамаў грыбоў. Усе яны маюць статус нацыянальнага здабытку, а гэта азначае іх важнасць для краіны і падтрымку дзяржавы.

У 2019 годзе аб'ём выпуску біятэхналагічнай прадукцыі ў краіне склаў 878 млн рублёў, а экспарт — 18 млн долараў.

### Мыйныя сродкі з... прабіётыкам

Інстытут мікрабіялогіі НАН Беларусі валодае цэлым шэрагам апрабаваных навукова-тэхнічных распрацовак для сельскай гаспадаркі, аховы навакольнага асяроддзя, медыцыны, якія характарызуюцца высокай ступенню навізны, эфектыўнасцю і гатовыя да прамысловага ўкаранення.

— Калі ў 2011 годзе было выраблена мікрабіялагічнай прадукцыі прыблізна на 400 мільёнаў рублёў, то летась гэта сума склала ўжо 900 мільёнаў рублеў, — паведаміла журналістам **генеральны дырэктар дзяржаўнага навукова-вытворчага аб'яднання «Хімічны сінтэз і біятэхналогіі» — дырэктар Інстытута мікрабіялогіі НАН Беларусі Эмілія КАЛАМІЕЦ.** — Намі былі створаны мікробныя ўгнаенні, сродкі аховы раслін, фактары росту для павышэння прадукцыйнасці культур, шмат прэпаратаў для жывёлагадоўлі, якія замяняюць антыбіётыкі ў кармах, для прамысловага рыбаводства — на выхадзе атрымліваецца экалагічна чыстая рыба з высокай прадукцыйнасцю. Асабліва мы адчулі запатрабаванасць мікрабіялогіі, калі ў сувязі з пандэміяй закрыліся межы: так, у першым паўгоддзі на нашай вытворчасці было выпушчана на 150 тысяч долараў імпартазамяшчальнай прадукцыі. Мы запоўнілі прабел, які ўтварыўся.

У нас сёння ёсць магчымасць ствараць самыя розныя формы прэпаратаў: сухія, канцэнтраты, грануляваныя, вадкія... Гэта дазваляе нам захоўваць канкурэнтаздольнасць. Цяпер мы працуем над ачышчальнымі і мыйнымі сродкамі з прабіётычным кампанентам. Ёсць аналагі за мяжой, але яны вельмі дарагія, таму амаль не даступныя для нас. Такія прэпараты можна выкарыстоўваць у якасці мыйных сродкаў, напрыклад, у вагонах паяздоў, электрычак, бо там, дзе ёсць кандыцыянеры, назапашваецца патагенная мікрафлора. Яны будуць эфектыўныя і ў прамысловасці, і ў побыце. Гэта сумесны праект з «БелАсэптыкай». Мы ўключаем у сродкі мікраарганізмы, здольныя не толькі падаўляць патагены, але і прадуцыраваць ферменты, якія чысцяць паверхні. Падчас эпідэміі COVID-19 нам прапанoўвалі іх выпрабаваць, але пакуль мы не маем такога права. Між іншым, для дэзінфекцыі медыцынскіх памяшканняў яны могуць аказацца вельмі эфектыўнымі.

Працуюць у Інстытуце мікрабіялогіі і над стварэннем біягербіцыдаў, якія стануць альтэрнатывай гербіцыдам і зменшаць нагрузку на навакольнае асяроддзе.

### Клетачныя тэхналогіі

**Дырэктар Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі Нацыянальнай акадэміі навук Андрэй ГАНЧАРОЎ** расказаў аб распрацоўках у галіне клетачных тэхналогій і прымяненні стваловых клетак.

Выкарыстанне клетачных тэхналогій у медыцыне распачалося ў 70-я гады ХХ стагоддзя з перасадкі касцявога мозгу. А 90-я гады азнаменаваліся першымі работамі па прымяненні дэндрытных клетак у анкалогіі. Вельмі актыўна пачаў развівацца і такі кірунак, як выкарыстанне мезенхімальных стваловых клетак для лячэння самых розных захворванняў.

У Беларусі клетачныя тэхналогіі ў медыцыне пачалі актыўна развівацца з пачатку 90-х гадоў, гэта было ў большай ступені фундаментальныя даследаванні, накіраваныя на атрыманне клетачнага прадукту, а ў сярэдзіне 2000-х пачаліся першыя клінічныя выпрабаванні. Сёння навукоўцы з усяго свету робяць стаўку ў тэрапіі на біямедыцынскі клетачны прадукт. Ёсць меркаванне, што менавіта за клетачнай тэрапіяй — будучыня.

Усяго ў чалавечым арганізме налічваецца больш як 200 тыпаў клетак са сваёй спецыялізацыяй. Адны складаюць нашу нервовую сістэму, другія — крываносную, трэція фарміруюць касцявыя тканкі і гэтак далей. Ствалавыя ж клеткі не маюць ніякай «спецыялізацыі», але яны здольныя ператварацца ў любы тып клетак. І робяць гэта па працягу ўсяго жыцця чалавека ў залежнасці ад патрэб з боку тых ці іншых органаў. Па сутнасці, ствалавыя клеткі — бясцэнныя запасныя часткі, без якіх наш арганізм не змог бы абнаўляцца, вельмі хутка старэў бы і гінуў. Чым старэйшы чалавек, тым менш у яго запас ствалавых клетак.

— Цяпер у Беларусі дзейнічаюць каля 50 інструкцый, у якіх выкладзены метады аказання медыцынскай дапамогі з выкарыстаннем клетачных тэхналогій, — праінфармаваў Андрэй Ганчароў. — Далёка не кожная краіна можа пахваліцца такой вялікай колькасцю распрацаваных метадаў. У нашым інстытуце сканцэнтраваны як фундаментальныя даследаванні, так і распрацоўка біямедыцынскіх клетачных прадуктаў, іх вытворчасць, захоўванне і прымяненне. Ёсць аддзяленне клетачнай тэрапіі, дзе мы можам лячыць пацыентаў у амбулаторных умовах.

Мезенхімальныя ствалавыя клеткі маюць ярка выражаныя аднаўляльныя здольнасці, таму больш за палову ўсіх даследаванняў у свеце звязаны з іх выкарыстаннем. Беларускія медыкі і навукоўцы таксама прытрымліваюцца сусветных трэндаў. Мезенхімальныя ствалавыя клеткі вылучаюць з розных крыніц, у тым ліку з тлушчавых тканак, касцявога мозгу. Яны выкарыстоўваюцца з дзвюма мэтамі: для аднаўлення страчаных функцый (у тым ліку лячэння трафічных язваў) і для імунасупрэсіі. Такія ствалавыя клеткі падаўляюць імунітэт, а гэта карысна для лячэння аўтаімунных, алергічных і іншых захворванняў з празмерным запаленчым кампанентам, напрыклад, для захворванняў суставаў.

У краіне выкарыстоўваюцца таксама дэндрытныя клеткі. Іх задача — навучаць іншыя клеткі імуннай сістэмы змагацца з нейкім узбуджальнікам. Гэта можа быць альбо інфекцыйнае захворванне, альбо рак. Дэндрытныя клеткі пераважна выкарыстоўваюцца для лячэння анкалагічных захворванняў. «Клетачныя тэхналогіі — не панацэя, але яны дазваляюць павялічыць працягласць жыцця і прадухіліць рэцыдыў хваробы, — падкрэслівае Андрэй Ганчароў. — Зараз у Беларусі зарэгістравана восем біямедыцынскіх клетачных прадуктаў, з іх чатыры распрацаваны Інстытутам біяфізікі і клетачнай інжынерыі».

### Наш «партрэт» па ДНК

Яшчэ адзін вельмі важны кірунак у развіцці біятэхналогій закрываюць беларускія генетыкі. З поспехамі генетычнай навукі звязваюць надзеі на стварэнне прарыўных тэхналогій у сельскай гаспадарцы, харчовай прамысловасці, перамогу над цяжкімі захворваннямі чалавецтва і іх папярэджванне. Дасягненні



генетыкі прымяняюцца ў спорце, судова-медыцынскай практыцы, прыродаахоўнай дзейнасці, нават у гандлі, паколькі міждзяржаўнае перамяшчэнне тавараў патрабуе дадатковых мер кантролю.

У Рэспубліканскім банку ДНК чалавека, жывёл, раслін і мікраарганізмаў утрымліваюцца каштоўныя ўзоры ДНК еўрапейскага зубра, ДНК рыб, коней, калекцыя ўзораў ДНК несапраўдных трансфармантаў ільну-даўгунцу, якая не мае аналагаў у свеце... У банку захоўваюцца ўзоры ДНК пацыентаў са злаякаснымі і дабраякаснымі пухлінамі розных органаў, з бранхіяльнай астмай, астэапарозам, тугавухасцю і іншымі захворваннямі. Ёсць узоры ДНК карэнных жыхароў Беларусі з шасці этнаграфічных рэгіёнаў краіны, ДНК спартсменаў нацыянальных камандаў, штамы мікраарганізмаў, якія выкарыстоўваюцца ў вытворчасці ферментаваных малочных прадуктаў, а таксама біяўгнаенняў і біястымулятараў росту раслін.

Па сутнасці, сабраныя калекцыі ўяўляюць сабой аналаг бібліятэкі сістэматызаваных генетычных першакрыніц (на кожны новы ўзор складаецца пашпарт), да якіх навукоўцы змогуць звярнуцца ў любы момант. Магчыма, у будучыні, калі малекулярная генетыка зробіць гіганцкі рывок наперад, усе гэтыя ўзоры стануць унікальным матэрыялам для даследчыкаў...

Па словах **дырэктара Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Руслана ШАЙКО**, ёсць ў Рэспубліканскім цэнтры геномных біятэхналогій аказваюцца паслугі па генетычным тэсціраванні схільнасці да больш чым 20 сацыяльна значных захворванняў: сярод іх сардэчна-сасудзістыя захворванні, астэапароз, дыябет другога тыпу, тромбафілія. У найбліжэйшы час плануецца пашырыць спектр паслуг. Стане магчымым вызначэнне індывідуальных генетычных асаблівасцяў метабалізму вітамінаў, алкаголю, халестэрыну, старэння скуры, стану валасоў.

Ужо цяпер распрацоўваюцца тэхналогіі для мэт крыміналістыкі, якія дазваляюць вызначаць узрост і знешнасць невядомага індывіда па ўзоры яго ДНК. Вывучаюцца генетычныя механізмы індывідуальнай адчувальнасці да лекавых прэпаратаў, якія будуць выкарыстоўвацца пры распрацоўцы ДНК-маркераў для клінічнай практыкі, прычыны доўгажыхарства.

У Інстытуце генетыкі і цыталогіі распрацавана таксама праграма вызначэння псіхаэмацыянальнага статусу чалавека: яна ўключае апаратныя метады псіхафізіялагічнага тэсціравання, якія ў адрозненне ад псіхалагічных тэстаў аб'ектыўна ацэньваюць стан чалавека. Навукоўцы спадзяюцца, што параўнанне вынікаў псіхафізіялагічнага тэсціравання з данымі малекулярна-генетычнага аналізу дазволіць выявіць найбольш інфарматыўныя гены, асацыяваныя з псіхаэмацыянальнымі асаблівасцямі чалавека, і распрацаваць ДНК-тэхналогію вызначэння схільнасці да асобасных расстройстваў, асацыяльных паводзінаў, уключаючы схільнасць да агрэсіі, суіцыдаў, дэпрэсіі і гэтак далей.

Псіхаэмацыянальныя якасці і стрэсаўстойлівасць важныя для прадстаўнікоў многіх прафесій, а не толькі для ратавальнікаў ці вадалазаў, тым больш што прычынай большасці тэхнагенных катастроф становіцца чалавечы фактар. У спорце таксама вельмі часта спартыўны вынік залежыць ад стрэсаўстойлівасці атлета. А ў некаторых відах спорту, наадварот, патрабуецца агрэсіўнасць. Генетыкам яшчэ трэба будзе разабрацца, якія псіхаэмацыянальныя якасці і для якога спорту прыярытэтныя.

Дарэчы, летась у інстытуце была створана група біяінфарматыкі, што дазваляе ажыццяўляць распрацоўку метадаў і алгарытмаў аналізу з вялікім масівам геномных даных.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Жыві і квітней, Беларусь! Пабудавана ў Беларусі

*У нашай краіне адкрыццё новых аб'ектаў сацыяльнага прызначэння і прамысловасці стала традыцыяй не толькі ў гонар свят. І гэта не папулізм, а даніна рэаліям часу, практыка, напрацаваная дзесяцігоддзямі.*

# Інвестыцыі акупяцца з лішкам

**Комплексная мадэрнізацыя на ААТ «Нафтан» у многіх на слыху. У сімвалічным пуску самай вялікай у краіне ўстаноўкі вытворчасці элементарнай серы перадавым метадам узяў удзел Мікалай ШАРСНЁЎ, старшыня Віцебскага аблвыканкама.**



Атрымaная сера ў руках старшыні Віцебскага аблвыканкама Мікалая ШАРСНЁВА.



Устаноўка вытворчасці элементарнай серы.

У рэалізацыю праекта інвеставана прыблізна 130 мільёнаў долараў. Пра маштабы будаўнічых і мантажных работ можна меркаваць па колькасці людзей, якія ў іх задзейнічаны, — а гэта каля 500 будаўнікоў і спецыялістаў па ўстаноўцы і наладжванні абсталявання. Новая апаратура дазволіць паменшыць імпарт і добра зарабляць на экспарце.

Наогул, калі будзе поўнасцю рэалізавана інвестыцыйная праграма, на «Нафтане», глыбіня перапрацоўкі нафты павялічыцца да 90 %, а ўзровень выхаду светлых нафтапрадуктаў — да 65 %.

Цяпер завяршаецца будаўніцтва новых для навапалацкага нафтахімічнага комплексу аб'ектаў. Сёлета запланавана ў асноўным скончыць мадэрнізацыю прадпрыемства, самую маштабную за ўсю гісторыю яго існавання. Паводле слоў **Аляксандра ДЗЯМІДАВА, генеральнага дырэктара ААТ «Нафтан»**, менавіта бягучы год абяцае стаць вельмі значным. Мясцовая ўлада разумее, што прыйшоў час напаўнення казны не толькі за кошт перапрацоўкі.

А ў Оршы, дзе актыўна працягваецца перазагрузка ўсяго раёна, нядаўна прэзентавалі рэканструяваны Палац культуры. Другое жыццё ў гэты аб'ект удыхнулі прыкладна за дзесяць месяцаў. Цяпер там новыя фасады з якасцямі «футра», дах, вадаправод, сістэмы каналізацыі і электразабеспячэння.

Мікалай Шарснёў падкрэсліў, што без падтрымкі кіраўніка дзяржавы палац культуры, пабудаваны яшчэ ў 1950-я гады, наўрад ці стаў бы такім прыгожым за параўнальна кароткі тэрмін.

Дарэчы, тут у гуртках і студыях займаюцца больш за 440 дзяцей, падлеткаў і дарослых. Сярод іх ёсць і шэсць калектываў са званнем народны.

Аб'ект культуры стане годным месцам для правядзення фестываляў, канцэртаў, конкурсаў, алімпіяд творчасці, а таксама адным з сімвалаў развіцця старога, але вечна маладога горада, куды цягне вярнуцца і які не сорамна паказаць гасцям.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ХУТКАЯ І НЕАДКЛАДНАЯ

**На мінулым тыдні адбылося ўрачыстае адкрыццё новай станцыі хуткай і неадкладнай дапамогі ў Баранавічах. У зоне яе абслугоўвання (гэта горад і раён) жыве больш за 210 тысяч чалавек. Памяшканне пасляваеннай пабудовы не адпавядала патрэбам сучаснай медыцынскай установы. Таму для станцыі ўзвялі новы двухпавярховы будынак.**

У ім прадугледжаны кабінеты амбулаторнага прыёму пацыентаў. Яшчэ на першым паверсе размяшчаецца дыспетчарская служба, службовыя памяшканні, душавыя пакоі. Стэрылізацыйнае аддзяленне аснашчана сучаснымі сухажаравым і паравым стэрылізатарамі. Другі паверх аддалі пад адміністрацыю, пакоі адпачынку персаналу, сталоўку, канферэнц-залу.

Адзіным комплексам да станцыі хуткай прыбудаваны гараж на 20 аўтамабіляў. Ёсць аўтамыйка замкнутага цыклу. На тэрыторыі ўладкавана памяшканне для напаўнення кіслародных балонаў. Ёсць летняя стаянка для санітарнага транспарту і асабістых машын супрацоўнікаў.

— Вельмі важна стварыць годныя ўмовы работы для тых, хто стаіць на перадавой барацьбы за здароўе людзей, — падкрэсліў **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ**, які прыехаў павіншаваць калектыў з важнай падзеяй. Паспяховай работы медыкам пажадалі таксама ў гэты дзень **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС, міністр аховы здароўя краіны Уладзімір КАРАНІК.**

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## ЯШЧЭ АДЗІН ДЗІЦЯЧЫ САД

**У аграгарадку Калодзішчы Мінскага раёна адкрыўся новы сучасны дзіцячы садок № 3. Яго будуць наведваць 230 малых, для якіх укамплектавана 12 груп у залежнасці ад узросту. Пяць груп разлічаны на дзяцей ад 3 да 4 гадоў, чатыры групы — ад 4 да 5 гадоў і тры групы — ад 5 да 6 гадоў.**

Да паслуг малых — музычная і харэаграфічная залы, кабінеты настаўніка-дэфектолага і педагога-псіхолага. Для педагогаў створаны інфармацыйна-метадычны кабінет. Ва ўстанове будуць працаваць харчовы і медыцынскі блокі, аснашчаныя найноўшым тэхналагічным абсталяваннем.

Для выхаванцаў з асаблівасцямі фізічнага развіцця створана безбар'ернае асяроддзе, а спецыяльная сістэма відэаназірання дазволіць кантраляваць усю вонкавую тэрыторыю.

У садку прадугледжаны таксама неабходныя ўмовы для аказання разнастайных паслуг дадатковай адукацыі зыходзячы з запыту бацькоў. Асаблівасцю дзіцячай установы стане спецыяльны цэнтр тэхнічнага канструявання. Заняткі будуць садзейнічаць пазнавальнаму развіццю дзяцей, фарміраванню ў іх лагічнага мыслення.

Дададзім, што дашкольная ўстанова пабудавана за кошт рэспубліканскага і абласнога бюджэтаў — ААТ «Заслаўебудіндустрыя».

Ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця прыняў удзел **намеснік старшыні Мінаблвыканкама Іван МАРКЕВІЧ.** Як адзначыў Іван Станіслававіч, у цэнтральным рэгіёне шмат увагі аддаецца развіццю сацыяльнай сферы: адукацыі, ахове здароўя, турызму, сацыяльнай абароне насельніцтва. Да канца года на Міншчыне адкрыецца яшчэ дванаццаць розных устаноў сацыяльнага прызначэння. Гэта школы, дзіцячыя сады, дамы культуры.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## І МАСТАЦТВУ, І СПОРТУ

**Пасля заканчэння летніх канікул прыбранымі і абноўленымі да заняткаў класамі сустрэне дзяцей і педагогаў гістарычная частка будынка Рэспубліканскай гімназіі-каледжа пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, што знаходзіцца на плошчы Свабоды ў Мінску.**

Пасля рамонту ў юных музыкаў, якія навучаюцца тут, з'явілася прасторная канцэртная зала, спецыялізаваныя харавыя класы, гуказапісная студыя. Школе пашанцавала не толькі з рэканструкцыяй самога будынка, але і з новым абсталяваннем і музычнымі інструментамі. Напрыклад, сюды было пастаўлена некалькі дзясяткаў высакакласных раяляў і піяніна.

У цырымоніі адкрыцця гімназіі-каледжа, што прайшла нядаўна, узялі ўдзел **міністр культуры Юрый БОНДАР і старшыня Мінгарвыканкама Анатоль СІВАК.**

А днём раней адразу два абноўленыя футбольныя палі «ўвялі ў строй» у Зялёным Лузе. У Савецкім раёне сталіцы на вуліцы Гамарніка пасля рамонту адкрыўся комплекс плоскасных спартыўных збудаванняў. На працягу дня на абноўленых палях прайшлі футбольныя матчы сярод аматарскіх камандаў і дзіцячых футбольных клубаў. Юныя футбалісты, апрабаваўшы пакрыццё, засталіся ім задаволеныя і цяпер гатовыя зноў гуляць і забіваць галы.

Пасля адкрыцця стадыёна сюды запрашаюць і жыхароў Савецкага раёна, і мінчан наогул: не толькі прафесійныя каманды або дзіцячыя спартклубы, але і ўсіх ахвотных. Згуляць можна ў футбол, валейбол, тэніс.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

## НА ПАЎГОДА РАНЕЙ

**Больш за тысячу студэнтаў Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы рыхтуюцца стаць навасёламі сучаснага інтэрната. Будынак быў уключаны ў рэспубліканскую інвестпраграму ў 2018 годзе, пасля наведвання ўніверсітэта кіраўніком дзяржавы.**



Аб'ект можна назваць адным з найбуйнейшых інтэрнатаў рэгіёна. Па-сучаснаму выглядае не толькі сам інтэрнат, які мае блочную сістэму пражывання. Абсталяваны і дворык, дзе размясціліся пляцоўкі для стрытбола, валейбола і міні-футбола.

Новы 13-павярховы будынак удала ўпісваецца ў гарадское асяродзе, мае добрую транспартную інфраструктуру. А ўзнавілася будаўніцтва па просьбе студэнтаў, якія звярнуліся да кіраўніка дзяржавы падчас яго наведвання Гродзенскага ўніверсітэта.

Зараз тут вядуцца заключныя ўнутраныя работы, завозіцца мэбля.

Інтэрнат пабудаваны па кватэрным прынцыпе. На тры пакоі — кухня, санвузел, душ і кладоўка. Кожнае памяшканне будзе абсталявана мэбляй і бытавой тэхнікай. Усяго такіх блокаў — амаль 170, кожны пакой разлічаны на пражыванне двух чалавек. Вядома, устаноўлены ліфт, ёсць пандус і пакой для людзей з абмежаванымі магчымасцямі.

На першым паверсе размясціліся адміністрацыйна-гаспадарчыя службы, буфет, медыцынскі блок, памяшканні для культурна-масавых мерапрыемстваў, бібліятэка з чытальнай залай. Таксама ў інтэрнаце прадугледжана 12 кабінетаў для самападрыхтоўкі, будуць працаваць гурткі і студыі. У дворыку абсталяваны спартыўныя пляцоўкі з сучасным пакрыццём. Актыўна адпачываць «купалаўцы» змогуць на чатырох пляцоўках, прадугледжаны і трыбуны для гледачоў на 70 месцаў. Таксама абсталяваны тры навесы для ровараў.

Здаць будынак плануецца да пачатку новага навучальнага года, што амаль на паўгода раней запланаванага тэрміну. Праектная магутнасць новага інтэрната — 1030 месцаў. Можна сказаць, што колькасць месцаў для пражывання іншагародніх студэнтаў удвоіцца. Гэта дае магчымасць забяспечыць інтэрнатам каля 80 % такіх студэнтаў.

Літаральна паўгода таму зададзены аналагічны будынак для студэнтаў-медыкаў. Па даручэнні кіраўніка дзяржавы на абсталяванне інтэрната выдзелена каля 30 мільёнаў рублёў. Агульны кошт будынка — амаль 50 мільёнаў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# Сацыяльны падмурак

**У Петрыкаве з'явілася сучасная вяслярная база. Старая вучэбна-трэніровачная пляцоўка па веславанні, пабудаваная ў 80-х гадах мінулага стагоддзя, знаходзілася ў аварыйным стане. Уладальнік спартыўнага аб'екта — Гомельскае абласное аб'яднанне прафсаюзаў — прыняў рашэнне знесці стары будынак, а на яго месцы ўзвесці новы.**

Цяпер база адпавядае ўсім сучасным патрабаванням. Набыты новыя лодкі. Апроч таго, падарунак ад Міністэрства спорту і турызму да адкрыцця аб'екта — сертыфікат на 5 тысяч рублёў — пойдзе на закупку вяслярных трэнажораў.

Зараз на вяслярнай базе ў Петрыкаве пастаянна займаюцца 60 спартсменаў. Але ў раённым цэнтры ўпэўнены, што колькасць ахвотных стаць выхаванцамі-веслярамі на новым аб'екце павялічыцца. Дарэчы, сярод гучных імёнаў, якія ўслаўляюць вяслярную школу ў Петрыкаве, — двухразовы бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў, трохразовы пераможца Еўрапейскіх гульняў, чэмпіёнка свету, Еўропы і нацыянальных першынстваў Марына Літвінчук.

Між тым у пасёлку Юбілейны Гомельскага раёна 36 шматдзетных сем'яў атрымалі ключы ад кватэр у новым доме. Жыллё пабудавана пры дзяржпадтрымцы згодна з Указам Прэзідэнта № 240. Кватэры палепшанай планіроўкі абсталяваны неабходнымі прыборамі ўліку рэсурсаў.

Летась на тэрыторыі Гомельскага раёна больш за 100 шматдзетных сем'яў змаглі палепшыць свае жыллёвыя ўмовы. У першым паўгоддзі ў раёне ўведзена ў эксплуатацыю каля 18 тысяч «квадратаў» жылля, а навасёламі сталі 40 шматдзетных сем'яў.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**



## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении 08 сентября 2020 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Управляющая компания холдинга «МИНСКИЙ МОТОРНЫЙ ЗАВОД»

| Предмет торгов |
|---|
| Капитальное строение с инв. номером в ЕГРНИ 500/С-4893 общей площадью 633,4 кв. м (наименование: здание гостиницы (литер Е 2/к); назначение: здание гостиниц, мотелей, кемпингов; составные части и принадлежности: пешеходная дорожка – 251 кв.м; отмостка – 32 кв. м; бордюр 0,08 – 42,5 п. м; ограждение; ворота (а, б); калитка (в, г)); капитальное строение с инв. номером в ЕГРНИ 500/С-1027655 общей площадью 18,3 кв. м (наименование: хозяйственно-питьевая водопроводная сеть); капитальное строение с инв. номером в ЕГРНИ 500/С-1027656 общей площадью 223,0 кв. м (наименование: кабельная линия 0,4 кВ); капитальное строение с инв. номером в ЕГРНИ 500/С-1027657 общей площадью 34,8 кв. м (наименование: хозяйственно-бытовая канализационная сеть); многолетние зеленые насаждения: ель колючая – дерево; ель колючая – дерево; обыкновенный (55 кв. м) газон; гортензия – кустарник; папоротник (8 кв. м) цветник; обыкновенный (67 кв. м) газон; сосна жесткая – кустарник; эригерон (32 кв. м) цветник; сирень обыкновенная – кустарник; летние (8 кв. м) цветник; гортензия – кустарник |
| Сведения о земельном участке:<br>площадь – 0,1024 га, кадастровый номер – 500000000001000367 |
| Местонахождение: г. Минск, ул. Щербакова, 36 |
| Начальная цена: 1 288 607,65 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 200 000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «Управляющая компания холдинга «МИНСКИЙ МОТОРНЫЙ ЗАВОД», ул. Ваупшасова, 4, 220070, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Управляющая компания холдинга «МИНСКИЙ МОТОРНЫЙ ЗАВОД», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (установленной формы), внесшие в установленном порядке задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ОАО «Белинвестбанк», центр банковских услуг № 527, г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП получателя 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 5 календарных дней с момента проведения аукциона при условии оплаты вознаграждения за организацию и проведение торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся **08 сентября 2020 года в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 10.08.2020 по 03.09.2020 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону (017) 398-96-47.

**Телефоны для справок:**
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 398-96-47 (ОАО «Управляющая компания холдинга «МИНСКИЙ МОТОРНЫЙ ЗАВОД»).

Запрашальнік

# ДЛЯ СТУДАТРАДАЎЦАЎ АДБУДЗЕЦЦА «STUDFEST-2020»

**8 жніўня з 10.00 да 13.00 Мінская гарадская арганізацыя БРСМ правядзе маладзёжны фэст для ўдзельнікаў студэнцкіх атрадаў STUDFEST-2020 (вул. Карастаянавай, 5, парк Дружбы народаў).**

Удзельнікамі фестывалю стануць больш за тысячу студатрадаўцаў. Любы ахвотны зможа паказаць свае танцавальныя магчымасці на зонах Just Dance і «Караоке для ног», аматары камп'ютарных гульняў будуць змагацца за тытул лідара на інтэрактыўнай зоне «Геймер». Паспрабаваць свае сілы на практыцы можна будзе ў гульнях «Гіганцкая джэнга і тэтрыс», аматары хакея і футбола пакажуць свой спрыт у настольным спорце, а трапнасць правераць падчас гульні з кольцамі. Вакальныя даныя таксама не застануцца незаўважаныя — зона караоке раскрые сілу голасу. Яркія эмоцыі можна будзе захаваць на зоне Speed foto.



Фота БелТА.

Арганізатары падрыхтавалі для ўдзельнікаў фестывалю спецыяльныя стыкеры, якія будуць выдаваць на кожнай інтэрактыўнай зоне. Абсалютна кожны стане ўладальнікам падарунка ад Саюза моладзі, а тры шчаслівчыкі атрымаюць падарункавыя сертыфікаты.

Акрамя таго, на працягу ўсяго фэсту на сцэне будуць выступаць беларускія артысты, кавер-бэнды і запрошаныя госці.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Гродненское областное потребительское общество (Дятловский филиал) извещает о проведении повторных электронных торгов

**АУКЦИОН № 3538, ЛОТ № 21275**

- Капитальное строение с принадлежностями, инвентарный номер 451/С-10967, площадью – 133,6 кв. м, назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака (кондитерский цех), наименование – кондитерский цех, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, г. п. Козловщина, ул. Советская, д. 16А.

Лот расположен на земельном участке с кадастровым номером 422382590602000378 площадью 0,1311 га (назначение – обслуживание кондитерского цеха).

Земельный участок не имеет ограничений (обременений) прав в использовании.

**Начальная цена продажи – 2 339,11 руб.** (две тысячи триста тридцать девять рублей 11 коп.) с учетом НДС. Сумма задатка – 233,91 руб.

**Дата и время начала электронных торгов: 05.08.2020, 12.00.**

**Дата и время завершения электронных торгов: 04.09.2020, 11.00.**

**Электронный адрес лота:** https://torgi.gov.by/lot/21275/3538/zdanie-konditerskogo-ceha-g-p-kozlovshina-dyatlovskogo-r-na

**Продавец** – Гродненское областное потребительское общество (Дятловский филиал), 231471, Гродненская область, г. Дятлово, ул. Ленина, 14, **тел. 8 (01563) 64581**

**Организатор аукционов** – Государственное предприятие «Информационный центр Минэкономики», г. Минск, ул. Берсона, д. 1А, оф. 513, **тел. 8 (017) 200 73 33**

Задаток – 10 % от стоимости лота перечисляется на счет электронной торговой площадки. Шаг торгов – 5 %.

Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 календарных дней с момента окончания торгов. Условия оплаты – не позднее 30 календарных дней с момента заключения договора

Победитель торгов возмещает стоимость затрат на проведение аукциона согласно прейскуранту (**https://torgi.gov.by/assets/docs/priceList/preyskurant.docx**) от фактической цены продажи лота, которая списывается с суммы внесенного Победителем аукциона задатка. Оставшаяся сумма задатка засчитывается в счет оплаты предмета аукциона. Возмещение затрат по организации и проведению аукциона победитель осуществляет не позднее 5 рабочих дней с момента завершения торгов

**Расчетный счет для перечисления задатка:** BY88 BELB 3012 0027 8700 2022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», код банка BELBBY2X, УНП 190318109 ОКПО: 37533622, Государственное предприятие «Информационный центр Минэкономики»

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона: **https://torgi.gov.by/info/auction-rule**

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5** |
| **Продавец** | **ЗАО «Молодечномебель», Минская обл., г. Молодечно, ул. Я. Дроздовича, 14** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**
**Месторасположение: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Либава-Роменская, 44**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентар. номер |
|---|---|---|---|
| **Здание прирельсового склада с рампой** | Здание специализир. складов, торг. баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ | 2050,7 кв. м | 630/С-71030 |

***Сведения о земельном участке***: пл. **0,3835 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания складов

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 277 183,51 бел. руб.**
(снижена на 10 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

При оплате предмета аукциона предоставляется рассрочка платежа на 12 месяцев, ежемесячно равными долями

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущие извещения о проведении аукциона опубликованы в газете «Звязда» от 03.03.2020

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов: 20.08.2020 в 14.00**<br>**Окончание торгов: 20.08.2020 в 15.00.**<br>Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 19.08.2020 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06.**<br>**E-mail: auction@cpo.by** |

## ООО «Фрондера» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Управляющая компания холдинга «Забудова»

| Лот | Наименование | Местонахождение | Начальная цена, бел. руб. без НДС | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение с инв. № 630/D-38127. Наименование: квартира. Назначение: квартира. Общая площадь: 37 кв. м. Адрес: Минская область, Молодечненский с/с, п. Чисть, ул. Максима Богдановича, д. 9Б-11 | Минская область, Молодечненский с/с, п. Чисть, ул. Максима Богдановича, д. 9Б-11 | 38 100,00 | 3 810,00 | 1 905,00 |
| 2 | Изолированное помещение с инв. № 630/D-5142. Наименование: квартира. Назначение: квартира. Общая площадь: 53,3 кв. м. Адрес: Минская область, Молодечненский с/с, п. Чисть, ул. 1-й Микрорайон, д. 6-11 | Минская область, Молодечненский с/с, п. Чисть, ул.1-й Микрорайон, д. 6-11 | 48 200,00 | 4 820,00 | 2 410,00 |
| 3 | Изолированное помещение с инв. № 630/D-5006. Наименование: квартира. Назначение: квартира. Общая площадь: 38.7 кв. м. Адрес: Минская область, Молодечненский с/с, п. Чисть, ул. Русанова, д. 53-15 | Минская область, Молодечненский с/с, п. Чисть, ул. Русанова, д. 53-15 | 39 300,00 | 3 930,00 | 1 965,00 |
| 4 | Изолированное помещение с инв. № 630/D-31819. Наименование: квартира. Назначение: квартира. Общая площадь: 53,1 кв. м. Адрес: Минская область, Молодечненский с/с, п. Чисть, ул. 1-й Микрорайон, д. 4-9 | Минская область, Молодечненский с/с, п. Чисть, ул. 1-й Микрорайон, д. 4-9 | 52 100,00 | 5 210,00 | 2 605,00 |

В отношении вышеуказанного имущества торги проводятся впервые после переоценки

**Условия**

В случае признания аукциона несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано единственным участником, либо единственный участник, явился для участия в аукционе, участник может приобрести Предмет (Предмета) торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель аукциона либо в случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано единственным участником, либо единственный участник явился для участия в аукционе, и он согласен приобрести Предмет (Предметы) по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Предмета (Предметов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, затрат на публикацию в течение 14 (четырнадцати) дней со дня проведения аукциона.

Оплата приобретенного на аукционе Предмета (Предметов) производится в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона и затрат по размещению публикации в газете и на сайте bankrot.gov.by на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.

**Вознаграждение аукциониста – 1 % от конечной цены предмета торгов**

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Начало приема заявлений в 10.00 05.08.2020 г. Окончание приема заявлений в 16.00 04.09.2020 г. по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121**

**Аукцион по лотам состоится 07.09.2020 в 12.00 (регистрация участников с 11.30 до 12.00) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121**

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте https://orgtorg.by.

До подачи заявления необходимо внести задаток на р/**с BY36ALFA30122215570040270000** в Отделении «На Красной» ЗАО «Альфа-Банк», код банка ALFABY2X, УНП 192789344.

Получатель – ООО «Фрондера». Назначение платежа: «задаток для участия в аукционе по продаже имущества ОАО «Управляющая компания холдинга «Забудова» (Лот №__), проводимом __.__.2020 г.». **Срок внесения задатка: с 10.00 05.08.2020 г. по 16.00 04.09.2020 г.**

Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Предметами аукциона. Контактное лицо для осмотра предметов: 8 (029) 171 09 46 (Кибзюк Дмитрий Николаевич).

По вопросам наличия обременений на вышеуказанные лоты обращаться по телефону 8 (029) 171 09 46 (Кибзюк Дмитрий Николаевич).

Дополнительная информация по предмету торгов, по телефону +375 29 308 28 97 (Анаида).

Организатор аукциона вправе после опубликования извещения о проведении аукциона отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.

**Государственная регистрация договора купли-продажи объектов недвижимости, предприятия как имущественного комплекса и объектов недвижимости, входящих в его состав, осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.**

Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера»**<br>**220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121: ☎ 8 (029) 305 86 50 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by** |
| **Продавец** | **ОАО «Управляющая компания холдинга «Забудова» в лице антикризисного управляющего ООО «Партнер-консультант»**<br>**☎ +375 (29) 698-51-76, +375 (29) 502-77-77, +375 (29) 392-89-06, +375 (17) 395-58-13** |

# 180 МІЛЬЁНАЎ ЕЎРА НА ЭНЕРГАЭФЕКТЫЎНАСЦЬ

**Міжнародныя фінансавыя інстытуты выдзелілі Беларусі сродкі на будаўніцтва кацельных і цеплавую мадэрнізацыю жылля.**

Беларусь накірue 180 мільёнаў еўра, атрыманых ад Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця і Еўрапейскага інвестыцыйнага банка, на будаўніцтва энергакрыніц і цеплавую мадэрнізацыю жылога фонду. Міжнародныя дагаворы аб рэалізацыі інвестыцыйнага праекта «Пашырэнне ўстойлівага энергакарыстання» зацверджаны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 3 жніўня 2020 года № 296.

Каб рэалізаваць інвестпраект, які разлічаны на 2020—2025 гады, Беларусь прыцягне не толькі пазычаныя сродкі ад міжнародных фінансавых арганізацый у памеры 180 мільёнаў еўра, але атрымае і 3,65 мільёна долараў у выглядзе гранта ад Глабальнага экалагічнага фонду. Як адзначылі ў Дэпартаменце па энергаэфектыўнасці, згаданы праект быў падрыхтаваны на развіццё работ па ўкараненні мясцовых відаў паліва і на рэалізацыю Указа Прэзідэнта ад 4 верасня 2019 года № 327 «Аб павышэнні энергаэфектыўнасці шматкватэрных жылых дамоў».

У рамках гэтага праекта плануюць пабудаваць і правесці рэканструкцыю 35 кацельных арганізацый жыллёва-камунальнай гаспадаркі і забяспечыць іх абсталяваннем для выкарыстання драўнянага паліва. Акрамя таго, у 249 шматкватэрных жылых дамах Гродзенскай і Магілёўскай абласцей будзе рэалізаваны комплекс энергаэфектыўных мерапрыемстваў па цеплавой мадэрнізацыі з прыцягненнем сродкаў насельніцтва.

— Калі гэты праект толькі пачынаў рэалізоўвацца, то ў краіне не было ўласнікаў, якія былі б згодны на правядзенне падобных работ, але зараз такіх шматкватэрных дамоў у Гродзенскай і Магілёўскай абласцях больш за дзясятак, і гэта тая магчымасць, якой трэба карыстацца ўжо зараз, — адзначыла **кансультант аддзела прававой работы, кадравай палітыкі і камунікацый Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Ала ГАРКУНОВА.**

❍ **ШТО ГЭТА ДАЕ?**

**35 новых кацельных дазволяць:**

— замяніць імпартны прыродны газ мясцовымі відамі паліва ў аб'ёме 100,34 мільёна кубаметраў ці 16,8 мільёна еўра ў год;

— павялічыць выкарыстанне мясцовых відаў паліва на 119,1 тысячы тон умоўнага паліва;

— панізіць сабекошт цяпла ў сярэднім на 20 %;

— павысіць надзейнасць цеплазабеспячэння спажыўцоў;

— паменшыць затраты арганізацый ЖКГ на ўтрыманне кацельных.

**Цеплавая мадэрнізацыя 249 шматкватэрных жылых дамоў дазволіць (лічбы вар'іруюцца ў залежнасці ад мерапрыемстваў, якія пажадаюць правесці ўласнікі ў сваіх дамах):**

— забяспечыць эканомію цяпла ад 7,6 да 37 %;

— забяспечыць агульнае зніжэнне выкідаў $CO_2$ у гэтых дамах ад 10 122,9 да 49 313,3 тоны у год;

— панізіць аб'ём спажывання цяпла на адну кватэру ў аб'ёме ад 0,54 да 2,55 Гкал у год, што ў сваю чаргу дазволіць сэканоміць на жыллёва-камунальных паслугах ад 4,1 да 19,4 еўра ў год;

— скараціць памер бюджэтнага субсідзіравання на паслугі цяпла для насельніцтва ад 317,3 да 1545,9 тысячы еўра ў год.

А як у іх?

# КАРЫСТАЮЦЦА МАГЧЫМАСЦЮ

## Як у іншых краінах падтрымліваюць цеплавую мадэрнізацыю дамоў

**Летась у Беларусі з'явілася фінансавая падтрымка на правядзенне цеплавой мадэрнізацыі шматкватэрных жылых дамоў. На палову неабходнай сумы ўласнікі маюць магчымасць атрымаць грант, другую ж палову ім прапаноўваюць аплаціць у растэрміноўку на 10-15 гадоў, у залежнасці ад даходу сям'і. Пры гэтым усе клопаты па арганізацыі работ возьме на сябе заказчык, якога вызначыць мясцовая ўлада. Аднак пакуль людзей, якія хочуць паўдзельнічаць у праекце, не вельмі шмат, нягледзячы на шчыльны графік арганізацыі такіх сходаў у беларускіх гарадах. Разам з экспертам расказваем, як гэты працэс выбудаваны ў іншых краінах, а менавіта — ва Украіне, у Казахстане і Латвіі.**



## «ЦЁПЛЫЯ КРЭДЫТЫ» УКРАІНЫ

Ва Украіне найбольш развітымі кірункамі з'яўляюцца праграма «Цёплыя крэдыты» для грамадзян і праграма па крэдытаванні, якая рэалізуецца праз Дзяржаўны фонд энергаэфектыўнасці.

— Праграма фонда стартавала летась і прапаноўвае падтрымку толькі тым, хто вырашыў стварыць юрыдычную асобу накшталт беларускіх таварыстваў уласнікаў і ЖСК, — расказвае **выканаўчы дырэктар Міжнароднай асацыяцыі менеджменту нерухомасці Генадзь КАЛЁНАЎ.** — А «Цёплыя крэдыты» пачалі выдаваць яшчэ ў 2014 годзе — з іх дапамогай украінцы могуць набываць энергаэфектыўныя тавары для добраўпарадкавання жылля. Меркавалася, што жыхары будуць выкарыстоўваць менш рэсурсаў на ацяпленне, гэта дапаможа краіне выйсці на новы ўзровень і яна стане незалежнай ад імпартных вугалю і газу.

Іншымі словамі, уласніку ці аб'яднанню ўласнікаў дзяржава кампенсуе частку сродкаў, якія яны затрацілі на ўкараненне энергаэфектыўных мерапрыемстваў. Што ж датычыцца аб'ёму такіх кампенсацый, то ён не мяняецца з 2014 года. Калі фізічная асоба набывае не газавы і не электрычны кацёл, то яна атрымае 20 % ад кошту мерапрыемстваў, але не больш за 12 тысяч грыўняў (крыху болей за 1000 беларускіх рублёў). Уладальнікам прыватных дамоў дзяржава можа кампенсаваць 35 % ад сумы, якую яны затрацілі на энергаэфектыўныя матэрыялы і абсталяванне, але не болей за 14 тысяч грыўняў (каля 1300 беларускіх рублёў). Калі ж кампенсацыю пажадае атрымаць аб'яднанне ўласнікаў, то кожнаму з іх (на адну кватэру) дзяржава аплаціць 40 % ад іх затрат, але не больш за 14 тысяч грыўняў.

Як адзначаюць у Дзяржаўным агенцтве па энергаэфектыўнасці Украіны, за пяць гадоў дзеяння праграмы ёй скарысталіся 750 тысяч украінскіх сем'яў, што складае насельніцтва каля 90 шматкватэрных жылых дамоў. Прыватныя інвестыцыі ў энергаэфектыўнасць склалі больш за 8 мільярдаў грыўняў (больш за 700 мільёнаў беларускіх рублёў), з іх 3 мільярды вярнулі ўкраінцам за кошт дзяржпраграмы. На 2020 год у дзяржаўным бюджэце Украіны на «Цёплыя крэдыты» выдзелена 400 мільёнаў грыўняў (больш за 35 мільёнаў беларускіх рублёў). Выходзіць, што 200 тысяч украінскіх сем'яў атрымаюць магчымасць скарыстацца дапамогай, а гэта, у сваю чаргу, дапаможа сэканоміць больш за 81 мільён кубаметраў прыроднага газу.

— Атрымаць «Цёплы крэдыт» вельмі проста — уласнік проста афармляе мэтавы крэдыт і выкарыстоўвае атрыманыя сродкі выключна на прадукцыю са спісу, які зацверджаны Дзяржаўным агенцтвам па энергаэфектыўнасці і энергазберажэнні Украіны, — тлумачыць Генадзь Генадзевіч. — Пасля гэтага дзяржава кампенсуе частку сродкаў уласніку і пераводзіць іх на рахунак банка-крэдытора.

Акрамя «Цёплых крэдытаў», са студзеня мінулага года ў краіне-суседцы працуе фонд энергаэфектыўнасці. Ён аказвае дапамогу толькі юрыдычным асобам — аб'яднанням уласнікаў накшталт беларускіх таварыстваў уласнікаў.

— Праз гэты фонд праводзяць энергаэфектыўныя мерапрыемствы шляхам выдзялення грантаў і ўкараняюць комплексныя тэхнічныя рашэнні з улікам найлепшых еўрапейскіх практык па цеплавой мадэрнізацыі будынкаў, — кажа эксперт. — Пры гэтым дзейнасць арганізацыі фінансуецца не толькі за кошт сродкаў дзяржбюджэту Украіны, але і пры падтрымцы Еўрасаюза і ўрада Германіі. Каб атрымаць яе, аб'яднанню ўласнікаў трэба прадставіць фонду пакет з 16 дакументаў, у тым ліку і рашэнне ўласнікаў на правядзенне пэўных мерапрыемстваў.

Грант уласнікам фонд плаціць у некалькі этапаў — на правядзенне энергетычнага аўдыту, на распрацоўку праектнай дакументацыі і на выкананне энергаэфектыўных мерапрыемстваў. А вось розніцу паміж дадзенымі часткамі і грантам аб'яднанне ўласнікаў павінна пагасіць самастойна ці ўзяць камерцыйны крэдыт, пры гэтым фонд публікуе карту, на якой паказаны заяўкі ад аб'яднанняў (якія ўжо рэалізуюцца, яшчэ разглядаюцца ці былі адхілены).

## ПІЛОТНЫЯ ПРАЕКТЫ

Казахстан яшчэ толькі напрацоўвае праграмы па энергаэфектыўнасці і ажыццяўляе пілотныя праекты з удзелам розных міжнародных арганізацый, у тым ліку па праектах беларускіх інстытутаў (напрыклад, Інстытута жылля — НДПТІБ імя С. С. Атаева).

— Большасці жылых будынкаў Казахстана, якім сёння больш за 30-40 гадоў, ужо неабходны капітальны рамонт, каб панізіць страты цяпла і забяспечыць яго рэгуляванне. Дах, які цячэ, аконныя рамы, што патрэскаліся ад часу, негерметычныя міжпанэльныя швы, а таксама існуючыя сістэмы спажывання цяпла і асвятлення, якія маральна і фізічна састарэлі, абумоўліваюць вялікі расход цяпла і энергіі, а значыць, і вялікі кошт гэтых паслуг, — тлумачыць Генадзь Калёнаў. — Эксперты праектаў ПРААН-ГЭФ па энергаэфектыўнасці падлічылі, што патэнцыял эканоміі энергіі ў шматкватэрных дамах Казахстана можа складаць ад 20 % да 50 % і болей. Цяпер у іх некамфортна, а камунальныя праблемы, якія часта ўзнікаюць, выклікаюць справядлівыя нараканні з боку жыхароў. Але дзе ўзяць грошы на рамонт, які прынясе выгаду людзям і якія менавіта работы трэба выконваць у такіх дамах? Пошукам адказаў займаюцца якраз эксперты ПРААН-ГЭФ падчас рэалізацыі пілотных праектаў у краіне.

Напрыклад, адзін з такіх праектаў рэалізоўвалі з 2018 да 2020 года ў горадзе Цэміртау — ажыццявілі комплексную цеплавую мадэрнізацыю тыпавога жылога шматкватэрнага дома. Галоўнай мэтай ініцыятывы было прадэманстраваць магчымасці змешанага суфінансавання з боку сродкаў бізнесу, уласнікаў кватэр і грантаў. Праект выконвалі разам з гаспадарамі кватэр жылога дома, прадстаўнікамі кааператыва ўласнікаў кватэр, які абслугоўвае гэты дом, прыватнага бізнесу пры падтрымцы Праграмы малых грантаў ГЭФ і Праграмы развіцця ААН. Больш за тое, ініцыятыва ўвайшла ў пералік мерапрыемстваў комплекснага плана аб мерах па паляпшэнні экалагічнай сітуацыі Карагандзінскай вобласці.

У рамках праекта ўцяплілі падвал дома, выканалі работы па герметызацыі міжпанэльных швоў, адрамантавалі і ўцяплілі дах, замянілі вокны і асвятленне ў пад'ездах, усталявалі так званае «разумнае ацяпленне» і ўцяплілі разводныя трубаправоды ў падвале. Што ж датычыцца кошту, то 20 мільёнаў тэнге (каля 120 тысяч беларускіх рублёў) склаў грант з боку Праграмы малых грантаў ГЭФ і Праграмы развіцця ААН, а 2,5 мільёна тэнге (каля 15 000 беларускіх рублёў) уласнікі кватэр прыцягнулі ў выглядзе энергасэрвіснага дагавора з боку прыватнага бізнесу. Згодна з падпісаным пагадненнем, жыхары вяртаюць кампаніі грошы, якія былі затрачаны на ўстаноўку «разумнага ацяплення», уцяплення трубаправодаў у падвале і замену існуючай сістэмы асвятлення на святлодыёдныя тэхналогіі. Пры гэтым штомесячныя плацежы на адну кватэру (каля 35 тэнге, ці каля 20 беларускіх капеек за 1 квадратны метр) не перавышаюць памеру той эканоміі платы за цяпло і гарачую ваду, якую абумовілі мерапрыемствы, ажыццёўленыя ў рамках праекта.

— Пры гэтым спецыялісты ПРААН і Праграмы малых грантаў ГЭФ рэкамендуюць уласнікам кватэр такіх жылых дамоў збіраць частку сродкаў на рамонт агульнай маёмасці самастойна, бо некаторыя мерапрыемствы энергасэрвісны дагавор не кампенсуе, а ў нейкія месцы бізнес можа нават не прыйсці, — адзначае Генадзь Генадзевіч. — Датычыцца гэта мерапрыемстваў па ўцяпленні даху, фасада, замены вокнаў і іншых работ, якія неабходны, каб скараціць страты цяпла. Больш за тое, гранты будуць выдзяляць толькі асобным дамам, а ўласнікі астатніх павінны самастойна збіраць грошы на большую частку работ. Альтэрнатыва — аплачваць поўны кошт, устаноўлены энергетычнымі кампаніямі.

## ЗНІЖКА НА ПАДАТАК

У Латвіі дзейнічае дзяржаўная праграма суфінансавання сродкаў еўрафондаў «Праграма энергаэфектыўнасці шматкватэрных дамоў». Па звестках Міністэрства эканомікі Латвіі, з 2009 да 2019 года ў краіне было мадэрнізавана 740 дамоў, альбо 1,9 % ад неабходнага.

— У рамках гэтай праграмы аб'яднанні ўласнікаў шматкватэрных дамоў атрымлівалі кампенсацыю да 50 % ад кошту мадэрнізацыі і падтрымку ад мясцовых улад, — адзначае Генадзь Калёнаў.

Напрыклад, у Рызе падтрымка выяўлялася ў бясплатных кансультацыях па пытаннях энергаэфектыўнасці, якія аказвае Рыжская энергетычная агентура, суфінансаванні да 80 % расходаў па правядзенні энергааўдыту (але не больш за 426,86 еўра, або каля 1200 беларускіх рублёў на адзін дом) і ў 90-працэнтным зніжэнні падатку на нерухомасць для тых шматкватэрных дамоў, якія ўжо здзейснілі рэнавацыю на ўмовах праграмы энергаэфектыўнасці.

— Колькасць праектаў, якія рэалізуюцца, павялічвалася да 2014 года, але потым працэс пайшоў на спад, і ў 2016 годзе яна вярнулася на ўзровень 2012 года, — расказвае Генадзь Генадзевіч. — Часткова гэта звязана з новымі ўмовамі фінансавання з боку Еўрасаюза, якія сталі больш складаныя, і з даволі вялай палітыкай стымулявання гэтых працэсаў з боку дзяржавы.

Як лічаць спецыялісты няўрадавай арганізацыі «Офіс захавання і энергазберажэння», на агульнае аднаўленне існуючага савецкага жылога фонду Латвіі неабходна восем мільярдаў еўра (ці больш за 22 мільярды беларускіх рублёў), палова з якіх прыходзіцца на Рыгу.

**Валерыя КІСЛАЯ.**




Ілюстрацыя належыць музею Янкі Купалы.

# 17 ІМГНЕННЯЎ КУПАЛЫ

## Падборка ілюстрацый Васіля Шаранговіча прадстаўлена ў Мінску

**Супрацоўнікі літаратурнага музея Янкі Купалы некалькі разоў наведвалі графіка Васіля Шаранговіча, каб з яго асабістай калекцыі выбраць унікальныя ілюстрацыі да твораў Купалы — гравюры алоўкам, акварэллю і гуашшу, якія тады яшчэ ніколі нідзе не выстаўляліся. У выніку летась сямнаццаць твораў майстра папоўнілі фонд музея, а сёння яны прадстаўлены ў адмысловай экспазіцыі — 6 жніўня тут адкрылася выстава «Водклік песняў», дзе можна ўбачыць тыя самыя адабраныя арыгінальныя творы мастака і некалькі колішніх выданняў Купалы з выявамі Васіля Шаранговіча.**

У музеі захоўваецца больш за сотню графічных работ аўтара — яго малюнкі паводле Міцкевіча, Шаўчэнкі, Пушкіна ды іншых. Творы, прадстаўленыя на выставе цяпер, — гэта задуманая даўно, а ўвасобленая толькі ў 1990-х серыя не «прамых» ілюстрацый, а работ па матывах твораў Купалы. Тут прадстаўлены гравюры да «Кургана», «Адвечнай песні», «Бандароўны», «Адплаты каханя», паэмы «Яна і я», зробленыя ў нязвыклай для мастака манеры.

У экспазіцыю таксама ўключана вялікая літаграфія 1976 года да верша і некалі неафіцыйнага гімна Беларусі «А хто там ідзе?». Яна ўяўляе сабой у пэўным сэнсе трыпціх, дзе ў цэнтры выяўлены беларускія творцы — уласна сам Янка Купала, а таксама Францыск Скарына, Кастусь Каліноўскі, Якуб Колас, Францішак Багушэвіч, Васіль Цяпінскі, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Максім Багдановіч ды іншыя. Злева бачныя тыя самыя «беларусы, што на худых плячах нясуць сваю крыўду», а справа — тыя, хто хоча «людзьмі звацца» ў вобразе касінераў, бо вядома, што Купала любіў тэму паўстання 1863 года і нават кантактаваў з адным з кіраўнікоў паўстання Зыгмунтам Чаховічам. Дарэчы, наперадзе грамады ў правай частцы Васіль Шаранговіч выявіў свайго бацьку Пятра — каваля, які пражыў 95 гадоў.

Вядомы мастак таксама ілюстраваў кнігі Якуба Коласа, Адама Міцкевіча, Змітрака Бядулі, Уладзіміра Караткевіча, Рыгора Барадуліна, але з Купалам было звязана і нешта асабістае. Сам Васіль Шаранговіч успамінаў дзяцінства, калі яго маці, седзячы за кроснамі або калаўротам, прасіла яго, школьніка, пачытаць Янку Купалу.

«Лірыка Купалы займае ў творчасці Васіля Шаранговіча адметнае месца — ён пісаў шмат і ілюстрацый, і вобразаў па матывах твораў паэта, — кажа **мастацтвазнаўца і дачка графіка Наталля ШАРАНГОВІЧ.** — Любоў да паэзіі Купалы сапраўды была прывіта яму з дзяцінства, яго маці шмат вершаў чытала на памяць, ён і сам шмат ведаў ужо са школы. У якасці дыпломнай работы ў тэатральна-мастацкім інстытуце Васіль Шаранговіч выбраў якраз ілюстрацыі па матывах лірыкі Янкі Купалы, што стала першым крокам у спасціжэнні творчасці паэта. Паводле традыцыі дыпломныя работы ў тыя часы выстаўляліся ў Маскве, і серыя работ майго бацькі была адзначана дыпломам Акадэміі мастацтваў СССР, што па тым часе лічылася вялікай узнагародай для маладога творцы».

Як адзначае Наталля Шаранговіч, тыя ілюстрацыі апроч класічнага разумення творчасці Купалы ўтрымліваюць яркі фармальны падыход да кампазіцыі, а графіка знаходзіцца на мяжы лінагравюры і ксілаграфіі, з'яўляецца адначасова лірычнай і драматычнай. «Купала мог паказаць як узвышанасць рамантычных пачуццяў, так і драматызм, і гэты драматызм у ілюстрацыях Васіля Шаранговіча, якія б работы вы ні паглядзелі, ёсць заўжды».

Галоўнае ж, што вызначае творы ў «Водкліку песняў» — іх экспрэсіўная стылістыка: «Хоць мастак і аднёсіцца да класікі беларускай графікі, яшчэ студэнтам ён быў прыхільнікам пошукаў экспрэсіўнай фармальнай мовы, якая найбольш выявілася менавіта ў прадстаўленай серыі».

Выстава «Водклік песняў» будзе працаваць у літаратурным музеі Янкі Купалы да 17 верасня.

**Сафія ПАЛЯНСКАЯ.**

У закрытай прасторы

# ВОБРАЗЫ ЛЕГЕНДЫ

## Вера ў чалавека ў графіцы Арлена Кашкурэвіча



Нібыта прывітанне з дзяцінства: гэты малюнак я бачыла ў кніжцы казак, а той разглядала ў падлеткавым узросце, узрушаная сюжэтам «Дзікага палявання караля Стаха». Выстаўка — як уласная гісторыя сталення, бо гартаваць свядомасць і характар нам дапамагалі кнігі. У многіх, што выпала прачытаць мне і якія хацелася чытаць, былі ілюстрацыі Арлена Кашкурэвіча. Гэта былі кнігі беларускіх пісьменнікаў, з характарам — і ў сутнасці напісанага, і ў выявах. Але калі выбіралі пісьменніка, імя аўтара ілюстрацый заставалася нібыта «за кадрам», пры тым, што ў свядомасці ўсё роўна замацоўваліся менавіта яго вобразы.

Да канца жніўня ў Нацыянальным мастацкім музеі праходзіць мемарыяльная выстаўка графікі Арлена Кашкурэвіча як нагода прыгадаць тое, што было і для нас, і для гэтага чалавека істотным.

Летась адзначалася 90-годдзе мастака: экспазіцыя была падрыхтаваная да гэтай даты, каб паказаць найлепшае, што створана аўтарам — афорты, літаграфіі, акварэлі, жывапісныя творы. Кашкурэвіч валодаў рознымі тэхнікамі, але, здаецца, найбольш яркімі па эмацыянальным уздзеянні з'яўляюцца якраз яго графічныя творы.

Народны мастак Беларусі Арлен Кашкурэвіч быў з тых творцаў, што склалі гонар беларускай школы графікі.



Прыйшоўшы ў мастацтва ў пасляваенны час, калі людзі жылі з верай у новае жыццё, ён найперш шукаў веры ў чалавека. Магчыма, спачатку шукаў у самім сабе, намацваў, нібыта тонкую, але экспрэсіўную лінію, якая будзе вызначаць почырк майстра, не зважаючы на прынятыя «правільныя» падыходы. Нездарма, скончыўшы тэатральна-мастацкі інстытут, ён застанецца там выкладаць — выхавае творцаў, якія самі стануць майстрамі з адметным поглядам на мастацтва і на свет.

Уласны погляд на свет Кашкурэвіч уклаў у аўтарскія серыі, дзе кожная з работ нясе прапушчаны праз сябе адбітак рэальнасці — ці не таму яны скіраваныя не столькі на сюжэт, колькі на настрой. Напрыклад, серыі «Горад і людзі» ці «Майстры»: што ні работа — тое асобнае пачуццё, што ствараецца адметнай экспрэсіяй Кашкурэвіча. Што ні мікрарэальнасць — тое эмоцыя: захопленасць, боль, радасць, любоў, страсць. У чалавечым свеце ён здолеў выхопліваць тое, што ператварае цялесных істот у асоб з характарам.

Нават у кніжных ілюстрацыі ён умудраўся ўкладваць уласны погляд, што часам выклікала здзіўленне пісьменнікаў. З тым жа Уладзімірам Караткевічам, як калісьці прызнаваўся Кашкурэвіч, даводзілася спрачацца, каб адстойваць права на мастацкую праўду, на тое самае «я так бачу». Не гістарычныя дэталі цікавілі Кашкурэвіча як ілюстратара кніг, а самі героі, іх псіхалогія, боль, адчай і сіла характару.

Варта паглядзець на тварры герояў у ілюстрацыях Кашкурэвіча да кніг Купалы — мастак часта звяртаўся да яго твораў. Ілюстраваная ім кніга «Тры паэмы» была адзначана ўзнагародай другой ступені на Усесаюзным конкурсе «50 найлепшых кніг года» ў Маскве ў 1963 годзе. Але калі паглядзець на адлюстраваныя ў графіцы вобразы герояў паэм «Бандароўна», «Магіла льва» ці «Курган» — яны пададуцца знаёмымі сучаснікам, бо існуюць па-за часам: усё ж мяняцца могуць дэталі, антураж, але не беларускі характар. На гэтай зямлі і сёння жывуць такія людзі, як мужны гусляр, што спяваў праўдзівыя песні, як прыгажуня Бандароўна, для якой годнасць на першым месцы, як Машэка з паэмы «Магіла льва», што востра адчувае крыўду, але лёгка ператвараецца ў злачынцу, не саўладаўшы з пачуццямі і паставіўшы ў аснову жыцця нянавісць. Калі кнігі з гэтымі ілюстрацыямі ўжо аджылі сваё, бо зачытаныя некалькімі пакаленнямі, то графіка Кашкурэвіча — па-ранейшаму жывая: вызначальныя рысы народа не змяніліся. Можа, таму ілюстрацыі з кніг, прачытаных у школьныя гады, чапляюць і цяпер.

Мастак рабіў ілюстрацыі да кніг Быкава, Адамовіча, Караткевіча, Шамякіна. Кніжная графіка Арлена Кашкурэвіча сёння — гэта выдатны праваднік у свет беларускай літаратуры, якая адлюстравала самыя драматычныя моманты гісторыі народа і сказала пра нас галоўнае: мы моцныя. Ілюстрацыя — гэта сканцэнтраваная думка, таму нават у малюнках, дзе, здаецца, беспрасветная цемра (да аповесцяў Быкава ці «Хатынскай аповесці») праз цемру прарываецца святло.

